# ВОДГУК АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

по дысертацыі Палтаржыцкай Надзеі Мікалаеўны
«Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст.
як крыніцы па гісторыі самакіравання горада»,
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады
гістарычнага даследавання

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.** Прадстаўленая дысертацыя адпавядае спецыяльнасці «07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання» галіны навукі «гістарычныя навукі» (п. 3 «Крыніцазнаўства» часткі III «Галіна даследавання» пашпарта спецыяльнасці 07.00.09, зацверджанага загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 2022 г. № 180).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Гарады на магдэбургскім праве – вельмі важная і адметная з'ява ў гісторыі беларускіх земляў перыяду іх уваходжання ў склад такіх дзяржаў, як Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітая. За апошнія дзесяцігоддзі з'явілася шмат новых цікавых даследаванняў па ўказанай тэме. Аднак, і ў наш час узровень вывучэння структуры, арганізацыі і ўнутранага жыцця многіх гарадскіх абшчын Беларусі позняга Сярэднявечча і пачатку Новага часу, у тым ліку і Мінска, застаецца яўна недастатковым. У асаблівай ступені гэта актуальна для перыяду з сярэдзіны XVII ст. да канца XVIII ст., што ў значнай ступені тлумачыцца характарам дакументальных помнікаў, створаных на беларускіх землях у гэты час. Захаваныя да нашага часу комплексы крыніц па гісторыі гарадоў Беларусі другой паловы XVII–XVIII ст., у тым ліку і дакументальная спадчына магістратаў, з'яўляюцца з шэрагу аб'ектыўных прычын найбольш цяжкімі для прачытання айчыннымі даследчыкамі і, адпаведна, найменш распрацаванымі ў беларускай гістарыяграфіі. Адна з асноўных прычын такога становішча – палеаграфічныя асаблівасці і мова крыніц, якая пасля паступовага сыходу ў другой палове XVII ст. з практыкі канцылярый старабеларускай мовы стала ўяўляць з сабе польскую мову з вельмі значным дадаткам лацінскіх слоў і выразаў, часта з самага пачатку запісаных з памылкамі. Тым не менш, захаваныя актавыя кнігі магістратаў другой паловы XVII–XVIII ст. складаюць аснову крыніцазнаўчай базы для правядзення даследаванняў па гісторыі беларускіх гарадоў (бо ранейшыя ў большасці выпадкаў не захаваліся), з'яўляюцца інтэгральнай часткай дакументальнай спадчыны беларускага народа і патрабуюць самага ўважлівага вывучэння. Усё пералічанае вышэй актуальна ў адносінах да Мінска, які мае асаблівае значэнне для Рэспублікі Беларусь. Адным з ключоў да выпраўлення сітуацыі са сталіцай краіны з'яўляецца усебаковае вывучэнне, вызначэнне крыніцазнаўчай каштоўнасці і ўвядзенне ў навуковы ўжытак матэрыялаў актавых кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст., якія раней на неабходным узроўні не даследаваліся.

Актуальнасць темы дысертацыі Палтаржыцкай Н.М. не выклікае сумненняў. У ёй з улікам назапашанага ў гістарыяграфіі вопыта крыніцазнаўчых і ўрбаністычных даследаванняў упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы

праведзены комплекснае вывучэнне захаваных кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст., вызначэнне іх дакументальнага складу і спецыфікі, ацэнка ступені іх інфарматыўнасці і патэнцыялу з пункту гледжання даследавання структуры і дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Мінска. Прадстаўленая дысертацыя не толькі ўносіць значны ўклад у вывучэнне крыніц па гісторыі гарадскіх улад Мінска другой паловы XVII ст., а таксама арганізацыі і функцыянавання гэтых улад. Яна можа пацягнуць за сабой шэраг аналагічных даследаванняў, прысвечаных як Мінску больш позняга часу (XVIII ст.), так і іншым гарадам Беларусі другой паловы XVII–XVIII ст. Вынікі дадзенага даследавання, несумненна, дазволяць айчынным гісторыкам значна лепей разумець дакументальную спадчыну магдэбургскіх гарадоў Беларусі і стануць істотнай дапамогай пры яго планамерным вывучэнні.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, што выносяцца на абарону.** У вынесеных на абарону палажэннях дысертант канстатуе, што менавіта магістрацкія кнігі з'яўляюцца першачарговай крыніцай пры вывучэнні органаў гарадскога самакіравання Мінска з пункту гледжання інфарматыўнасці і дакладнасці, бо вядзенне названых кніг было інтэгральнай часткай дзейнасці і атрыбутам гарадскіх улад. Адзначаецца, што кніга спраў вячыстых за 1663–1680 гг. і кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. з'яўляюцца самымі раннімі з комплекса захаваных кніг Мінскага магістрата і адзінымі за другую палову XVII ст. Дысертант характарызуе спецыфіку дакументаў, уключаных у кнігу спраў вячыстых і кнігу пратаколаў, і на падставе падлікаў прыводзіць дакладныя працэнтныя суадносіны дакументаў розных тыпаў у складзе гэтых кніг. Адзначаецца, што спецыфіка дакументальнага складу мінскіх магістрацкіх кніг абумоўлена іх рознымі функцыямі. Кніга спраў вячыстых з'яўлялася сродкам зацвярджэня дамоваў, якія набывалі прававую моц у выпадку іх актыкацыі і выдачы выпісу. У ёй пераважаюць упісанні дакументаў па справах з нерухомай маёмасцю і фінансавых абавязацельствах, а таксама натарыяльныя завярэнні. Кніга пратаколаў выконвала пераважна мемарыяльную функцыю, а яе запісы выкарыстоўваліся для падрыхтоўкі дакументаў, што ўключаліся ў актавыя кнігі іншых тыпаў. У ёй пераважаюць сціслыя пратакольныя запісы з паседжанняў магістрата, якія адлюстроўваюць усе сферы дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Мінска, працу гарадскіхураднікаў і дапаможнага персаналу. Дысертант канстатуе, што кнігі Мінскага магістрата другой паловы XVII ст. змяшчаюць усе неабходныя дадзеныя для рэканструкцыі структуры і дзейнасці Мінскага магістрата, а таксама вывучэння яго персанальнага складу за абазначаны перыяд. Адзначаецца, што менавіта кніга пратаколаў за 1674–1680 гг. з'яўляецца найбольш інфарматыўнай крыніцай для правядзення даследаванняў судовай, фінансавай і адміністратыўна-распарадчай дзейнасці гарадскіх улад Мінска другой паловы XVII ст.

Дысертанту ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ўдалося ажыццявіць комплекснае вывучэнне захаваных кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст., вызначыць іх дакументальны склад і спецыфіку, ацаніць ступень іх інфарматыўнасці і крыніцазнаўчы патэнцыял. Глыбіня праведзенай дысертантам навуковай апрацоўкі гэтых крыніц дазваляе казаць пра іх увядзенне ў навуковы

ўжытак у поўным аб'ёме, пры чым увесь масіў інфармацыі ўводзіцца ў публічную прастору ўпершыню. Вельмі істотна, што Палтаржыцкай Н.М. праведзена не толькі крыніцазнаўчая, але і гістарычная праца. Дысертацыя фактычна змяшчае дастаткова падрабязнае наватарскае даследаванне арганізацыі і функцыянавання гарадскіх улад Мінска ў другой палове XVII ст. Вызначаны склад магістрата, функцыі і прынцыпы прызначэння на пасады службовых асоб, складзены спісы ўраднікаў магістрата з падзелам на гадавыя сесіі. Навуковую навізну даследавання забяспечвае таксама добрае валоданне дысертантам літаратуры прадмету, у тым ліку навейшай і замежнай. Такая грунтоўная база дазваляе даследчыку выпрацоўваць самастойныя высновы і пераканаўча абгрунтоўваць уласную пазіцыю па разгледжанай праблематыцы.

**Абгрунтаванасць і даставернасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі,** пацвярджаецца вывучэннем, абагульненнем і крытычным аналізам гістарыяграфіі прадмету даследавання і архіўных дакументаў. У спісе выкарыстаных дысертантам крыніц значыцца 109 пазіцый навуковых гістарычных прац (з вялікай доляй вузкаспецыяльных – па ўрбаністыцы Усходняй Еўропы) на беларускай, рускай, украінскай, польскай і літоўскай мовах, а таксама выданых друкам крыніц (у тым ліку, актавых кніг гарадоў Усходняй Еўропы ўказанага перыяду). Архіўныя крыніцы прадстаўлены дакументамі з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў колькасці 8 пазіцый. Гэта – аб'ёмныя справы з фондаў 145 «Мінская палата крымінальнага суда», 1706 «Бельскі гродскі суд», 1769 «Мінскі земскі суд», 1816 «Мінскі магістрат» (галоўным чынам, актавыя кнігі), ступень навуковай перапрацоўкі якіх, праведзенай дысертантам, вельмі высокая. Выкарыстаныя ў працы архіўныя дакументы ў сваёй пераважнай большасці ўводзяцца ў навуковы ўжытак упершыню. На падставе самастойна сабранага і прааналізаванага матэрыяла дысертант робіць абгрунтаваныя самастойныя высновы і выносіць на абарону новыя навуковыя палажэнні.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.** У дысертацыі Палтаржыцкай Н.М. упершыню ў беларускай гістарыяграфіі здзейснены комплексны навуковы аналіз захаваных магістрацкіх кніг Мінска другой паловы XVII ст. і прадстаўлена падрабязная карціна арганізацыі і дзейнасці гарадскіх улад Мінска ўказанага перыяду, што неабходна прызнаць несумненным і значным укладам у навуку. Акрамя таго, вынікі даследавання Палтаржыцкай Н.М. могуць быць выкарыстаны ў навуковай і адукацыйнай дзейнасці, пры распрацоўцы адукацыйных праграм і курсаў лекцый па гісторыі Беларусі і крыніцазнаўству, у далейшых урбаністычных даследаваннях, пры падрыхтоўцы экскурсій, музейных выстаў і экспазіцый, для стварэння біяграфічных даведнікаў.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Вынікі і навуковыя палажэнні дысертацыі апублікаваны ў 16 навуковых артыкулах, з ліку якіх 5 артыкулаў апублікавана ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для публікацыі вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Аналіз артыкулаў Палтаржыцкай Н.М. дазваляе зрабіць выснову пра тое, што асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання ў дастаткова поўнай

ступені адлюстраваны ў апублікаваных працах. Да таго ж, асноўныя вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на 16 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, дзе атрымалі станоўчую адзнаку.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Дысертацыя і аўтарэферат аформлены ў поўнай адпаведнасці з Інструкцыяй па афармленні дысертацыі і аўтарэферата ВАК Рэспублікі Беларусь. Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.** Усё вышэй пералічанае дазваляе ацаніць навуковую кваліфікацыю Палтаржыцкай Н.М. як адпаведную навуковай ступені кандыдата гістарычных навук.

**Заўвагі.** Разам з канстатацыяй высокага навуковага ўзроўня прадстаўленай дысертацыі неабходна ўсё ж спыніцца на некалькіх заўвагах і прапановах.

У дысертацыі, на наш погляд, празмерна вольна выкарыстоўваюцца такія паняцці, як «гарадское самакіраванне» ці «самакіраванне». Па ўсёй верагоднасці, тут мае месца ўплыў беларускай савецкай гістарыяграфіі, дзе любыя гарадскія ўлады абвяшчаліся «органамі гарадскога самакіравання», а ўвядзенне ў гарадах войтаўстваў звязвалася з нібыта наданнем мяшчанам «няпоўнага магдэбургскага права». Фактычна ж войт (разам з яго намеснікамі: лантвойтам, намеснікам лантвойта) атрымліваў свае паўнамоцтвы ад манарха ці ўласніка горада і з'яўляўся звяном вертыкалі ўлады. Варта нагадаць, што ў XVI–XVII стст. усяго некалькі беларускіх гарадоў здолелі праз выкуп ці іншымі шляхамі паставіць войтаўствы пад свой кантроль, і Мінск не адносіўся да іх ліку. Да таго ж, корпус бурмістраў, райцаў і лаўнікаў, часцей за ўсё, камплектаваўся з прадстаўнікоў гарадской вярхушкі, а ўплыў мяшчан на яго фарміраванне быў абмежаваным. Таму, ў дадзеным выпадку лепей было б часцей выкарыстоўваць больш нейтральны тэрмін «гарадскія ўлады».

Пэўныя пярэчанні выклікае таксама прадстаўлены ў дысертацыі вобраз «паспольства» як аднаго з органаў у структуры гарадскіх улад Мінска другой паловы XVII ст. (с. 48). Для дакладна вызначанага органа ўлады ён дастаткова аморфны. Па матэрыялах іншых беларускіх гарадоў указанага перыяда (Полацк) «паспольства», хутчэй, нагадвае сітуатыўнае прадстаўніцтва нізоў пры магістраце, а не жорсткую ўладную структуру.

На будучае, магчыма, варта было б таксама падумаць, ці можа быць для тэрміна «мужы гмінныя» (ад польск. «gmina» ці нямецк. «gemeinde» = «абшчына»), які ў сувязі з развіццём даследаванняў па гісторыі гарадоў эпохі позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу ўсё часцей трапляе ў навуковыя тэксты на беларускай мове, знойдзены лепшы беларускі адпаведнік.

У якасці прапановы, на выпадак працягу Палтаржыцкай Н.М. вядзення навуковых распрацовак па тэме, хацелася б пажадаць, каб тая частка дысертацыі, што датычыцца непасрэдна арганізацыі і дзейнасці гарадскіх улад Мінска другой паловы XVII ст. разам з гадавымі спісамі ўраднікаў, магчыма, дапоўненая і пашыраная храналагічна, у будучым выйшла з друку ў постаці асобнага навуковага выдання – кнігі ці брашуры.

Аднак, указаныя недахопы могуць быць лёгка выпраўлены і не зніжаюць агульны высокі ўзровень дысертацыі, каштоўнасць атрыманых навуковых і практычных вынікаў, а пажаданні носяць рэкамендацыйны характар.

**Высновы**

Дысертацыя Палтаржыцкай Н.М. «Актавыя кнігі Менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада», прадстаўленая на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, з'яўляецца самастойным даследаваннем, адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, утрымлімлівае прынцыпова новыя вынікі, сукупнасць якіх з'яўляецца буйным дасягненнем як у гістарычнай навуцы ў цэлым, так і ў галіне гістарычнага крыніцазнаўства ў прыватнасці.

Палтаржыцкай Надзеі Мікалаеўне можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання за:

- правядзенне ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплекснага даследавання захаваных актавых кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст. і вызначэнне іх як базавых крыніц па арганізацыі і дзейнасці гарадскіх улад Мінска гэтага часу;
- вызначэнне спецыфікі дакументальнага складу розных відаў актавых кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст.: кніг пратаколаў і кніг спраў вячыстых;
- правядзенне навуковай сістэматызацыі дакументаў актавых кніг Мінскага магістрата другой паловы XVII ст.і вызначэнне працэнтных суадносін розных тыпаў даументаў у іх складзе;
- правядзенне ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі вывучэння структуры, функцый, персанальнага складу ўраднікаў і дапаможнага персаналу Мінскага магістрата другой паловы XVII ст.

Афіцыйны апанент
намеснік дырэктара
дзяржаўнай установы
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі»,
кандыдат гістарычных навук М.Д. Макараў

Подпіс М.Д. Макарава сведчу.
Намеснік дырэктара
дзяржаўнай установы
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі» І.І. Каўганава

Водгук паступіў 06.06.2023 г
Вучоны сакратар савета В.П. Лакіза

З водгукам азнаёмлена
Н.М. Палтаржыцкая